Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

САКАВІК 28 1933 г. № 68 (4612)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

БУДЗЕМ У ПЕРШЫХ РАДОХ ЗМАГАРОЎ ЗА ДРУГУЮ ПЯЦІГОДКУ

Прывітаньне тав. Молатаву ад ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

Першы ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў шле вам сваё баявое прывітаньне. У вялікай барацьбе за ўмацаваньне калгаснага ладу, за ператварэньне калгасаў у сапраўды бальшавіцкія калгасы, мы, калгасьнікі-ударнікі, кіруючыся ўказаньнямі нашага правадыра тав. СТАЛІНА, будзем у першых баявых радох змагароў за другую бальшавіцкую пяцігодку.

Зьвярнуўшыся са зьезду ў сваё калгасы, мы пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі яшчэ вышэй узьнімем энтузіязм калгасных мас, мабілізуючы іх баявую, творчую энэргію на хутчайшае завяршэньне падрыхтоўкі да вясны, на сапраўднае бальшавіцкае правядзеньне пасеўной кампаніі.

Няхай жыве баявы штаб сацыялістычнага будаўніцтва—ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве брацкі саюз працоўных Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

ВЫКАНАЦЬ БАЛЬШАВІЦКІЯ РАШЭНЬНІ ЗЬЕЗДУ!

Пяць дзён працаваў першы ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. Пяць дзён перадавыя байцы за бальшавіцкія калгасы, лепшыя арганізатары калгаснай вытворчасьці цікавымі выраналі гісторычныя задачы нашай першай вясны другой сацыялістычнай пяцігодкі. Пяць дзён такой вялікай, такой напружанай работы, якая прыкавала ўвагу ўсёй краіны, увагу ўсіх рабочых, калгасьнікаў і працоўных сялян!

Што паказаў зьезд?

Першае і ў гэтым — галоўнае, зьезд з гіганцкай пераканаўчай сілай яшчэ і яшчэ прадэманстраваў бязьмерную адданасьць працоўнага сялянства нашай ленінскай партыі і савецкай уладзе.

Работа зьезду зьявілася яшчэ адным найвялікшым доказам сталёвай непарушнасьці саюзу рабочай клясы і працоўнага сялянства.

Тав. Шаранговіч у сваім дакладзе на зьездзе калгасьнікаў-ударнікаў на фактах і лічбах паказаў, якіх посьпехаў, якіх перамог дабіліся мы пад кіраўніцтвам нашага Сталіна, пад кіраўніцтвам нашай бальшавіцкай партыі ў справе калгаснага будаўніцтва.

Што ўяўляла сабою Беларусь яшчэ ў недалёкім мінулым? Нагадаем лічбы. Амаль палова ўсёй зямлі (11.645 тыс. дзесяцін з 22. 228 тыс.) валодала кулакам, памешчыкам і клерыкалам. Мільёны працоўных сялян або зусім ня мелі зямлі, або мелі такія жабрацкія і нікчэмныя кавалкі, якіх не хапала нават і на поўталоднае існаваньне. Адсюль і масавая эміграцыя. Адвечная галеча і голад плюс самая дзікая і необмежаная пулька-паменчыцкая эксплёатацыя—вось на што асуджаў стары лад працоўнае сялянства.

А цяпер? Што дала наша партыя працоўнаму сялянству? Чаго дабіліся мы, пераможна завяршыўшы першую бальшавіцкую пяцігодку, у выніку якой наш Саюз стаў перадавой індустрыяльнай краінай.

Гэта ленін за ўсё выказалі дэлегаты першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў у сваім прывітаньні тав. Сталіну.

«Пад выпрабаваным кіраўніцтвам рабочай клясы—пішуць дэлегаты,—і яе перадавога атраду—нашай ленінскай партыі і цябе, наш улюбёны правадыр т. Сталін, дзесяткі мільёнаў бедняцкай і серадняцкай назаўсёды пакончылі з катаржнай працай і галодным жыцьцём і выйшлі на адзіны правільны шлях калектыўнай працы.

У нас створаны ўсе необходныя ўмовы для таго, каб арабіць усе калгасы сапраўды бальшавіцкімі калгасамі і на аснове нашай упартай і сумленнай працы зрабіць усіх калгасьнікаў, усіх былых беднякоў і сераднякоў заможнымі.

Ад імя лепшых калгасаў, калгасьнікаў і калгасьніц БССР мы даем ленінскаму ЦК партыі і табе, дарагі наш правадыр тав. Сталін, непарушнае слова, што ў бліжэйшы час зьнішчым усе недахопы нашага калгаснага будаўніцтва і дабіемся арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня ўсіх калгасаў БССР».

2.181 калгас, 429 саўгасаў, 61 МТС—вось з чым мы сустрэлі першую вясну другой пяцігодкі. Усё гэта ня прыйшло да нас самацёкам. Свае перамогі, свае посьпехі мы зваявалі ў суровай і непрымірымай барацьбе, барацьбе не на жыцьцё, а на сьмерць з клясавым ворагам і яго агентурай.

Клясавы вораг разгромлен. Вулі разьбіт. У вёсцы капіталізм пазбаўлены карэнных сашэнькіў і нарэшце сацыялізму як і ў горадзе забяспечана. Але ворог не здаецца без бою. Разгромлены, але яшчэ нешкодны, кулак аказвае шалёнае супраціўленьне. Чым больш мы расьцем, чым больш мацнее наша магутнасьць, сіла нашай пралетарскай дыктатуры, чым больш мацнеюць нашы калгасы, тым з большай шпасьцю, з большым шаленствам рэшткі капіталістычных клясаў імкнуцца затармазіць, затрымаць наш рух наперад, падарваць і разваліць нашы калгасы. Вораг зараз, арэзумела, не выступае адкрыта. Ён выміне сваю тактыку, зьмяніў мэтады сваёй барацьбы. Пралезшы ў калгас, на калгасную стайню, у сувязку, на калгасныя фэрмы, у МТС, ён адтуль цілай самай правоцыць сваю контр-рэвалюцыйную, падрыўную справу.

Патрэбна асаблівая пільнасьць, патрэбна максымальная настароженасьць. Патрэбна самая бязьлітасная барацьба з рэшткамі недабітага ворага і яго агентамі.

Цяпер працоўнаму сялянству не пагражаюць голад і кулацкая эксплёатацыя. Партыя вывела працоўнае сялянства на адзіна правільны шлях—шлях калгасаў. Зварот да старога быць ня можа. Калгасы замацаваны капіталкова. Партыя і пралетарскае дыктатура далі калгасам лепшыя зямлі, трактары і машыны. Партыя дабілася таго, што цяпер у калгасах былыя беднякі скінуць ня горш за серадняцкоў. Самае галоўнае, самае асноўнае ў тым, «каб умацаваць калгасы арганізацыйна, вынайсьці адпушчы шкодніцкія элементы, падабраць сапраўдныя праверэныя кадры для калгасаў і зрабіць калгасы сапраўды бальшавіцкімі». Мы павінны зрабіць яшчэ адзін крок наперад—пайсьці на шчэ тым як сказа, каб кожны калгасьнік—і бедняк і серадняк, стаў заможным.

Наш зьезд адбываўся на парозе сяўбы. Клімаціычныя ўмовы ў гэтым годзе, як нельга лепш сьпрыяюць масавому разгортваньню звышпаўных палавых работ. У радзе паўднёвых раёнаў звышраньняя сяўба ўжо ідзе. У Слуцкім, Ельскім і іншых раёнах перадавыя калгасы ўжо засеялі першыя гэктары аўса.

Надышоў самы рашаючы час, надышло самае сур'ёзнае і рашаючае выпрабаваньне паказаць, як мы ўмеем працаваць, як мы гатовы выйграць наш галоўны бой—бой за бальшавіцкае правядзеньне весьнавой сяўбы.

Зьезд прыняў выклік Заходняй вобласьці на лепшае правядзеньне пасеўнай кампаніі. Гэта ўскладае на нас у тысячы раз большыя абавязацельствы і ў першую галаву на нашы партыйныя арганізацыі, на нашых дэлегатаў зьезду.

Будзе ганьбай, найвялікшай і нічым не апраўданай ганьбай, калі мы адстанем, калі мы ня выканаем сацыялістычнага дагавору з Заходняй вобласьцю.

А такая пагроза ЁСЬЦЬ.

Насеньне—адзін з самых асноўных і рашаючых вучасткаў весьнавой сяўбы. А як у нас стаць тут справы? Дрэнна, ганебна дрэнна. Бальшавіцкай, сапраўды бальшавіцкай, а не слабасна-дэкларацыйнай барацьбы за насеньне яшчэ няма. Справа-ж ня толькі ў тым, каб есьцьць насеньне. Галоўнае-ж у тым, каб ня толькі есьцьць, але і ачысьціць, апсартаваць, пратруціць і захаваць насеньне, каб забясьпечыць насеньнем зрывы клін у поўнай адпаведнасьці з зьцвячаным планам.

А што мы маем на сёньняшні дзень? Вось апошняя зводка НКЗ БССР аб ходзе ачысткі насеньня. Пра што яна сьцьвердзе? Перша—ні адзін раён у БССР яшчэ не выканаў сваіх заданьняў па ачыстцы насеньня. На некаторых раёнах і асабліва падмёсных, лічбы проста злачынныя. Возьмем для прыкладу толькі тыя раёны, дзе сяўба павінна разгарнуцца ў самы бліжэйшы час.

Лельчыцкі раён—49,3 проц. пляну ачысткі насеньня; Тураўскі—36,9; Мазырскі—26,7; Лоеўскі—58,1 і г. д., і г. д. Кіраўнікі гэтых раёнаў ня мала далі гарачых абяцаньняў ударна правесьці сяўбу і ўзьняць урэшце-ўрэшце калгасных палёў.

А чым яны зьбіраюцца сеяць, чым узнімаць ураджай? Незачышчаным, несапартаваным насеньнем!..

Вось такой ашыйнічные, такой бальбатне, такому нікоднаму пустаўвонству трэба даць сазы бязьлітасны і жалезны адпор. Гроп цана таму вамуцству, гроп цана таму раёнаму кіраўніку, які ва ўвесь голас крычыць аб узьдыме ураджайнасьці, аб ударных тэмпах сяўбы, а на справе, у сябе ў раёне, у сябе ў калгасе ня можа нават забясьпечыць своечасовай сёмі і ачысткі насеньня.

Зьезд калгасьнікаў-ударнікаў даў сапраўды бальшавіцкую пуцёўку на правядзеньне першай вясны другой пяцігодкі. За працу-ж, таварышы, за працу! Ня будзем траціць ні адной мінуты! Усе нашы сілы, усю сваю волю і энэргію—на весьнавы фронт!

Даб'ем кулака, нігадзя в калгасных вадох лодзьдаў і прагульшчыкаў, засеем, і добра засеем, увесь яравы клін!

Перыпнной рады вакол ЦК УсеКП(б) на чале з т. Сталіным, вакол ЦК ВКП(б) і яе ЦК!

Усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў правадыру партыі тав. Сталіну

Усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў, ад імя лепшых калгасьнікаў і дзесяткаў тысяч калгасьнікаў-ударнікаў БССР, вітае цябе, лепшага ўдарніка калгаснага ладу, любімага правадыра бальшавіцкай партыі, пралетарыяту і калгаснага сялянства.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам рабочай клясы, яе перадавога атраду нашай ленінскай партыі і цябе, наш любімы правадыр тав. СТАЛІН, дзесяткі мільёнаў беднякоў і сераднякоў назаўсёды пакончылі з катаржнай працай і галодным жыцьцём і выйшлі на адзіны правільны шлях калектыўнай працы.

БССР, з царскай калёніі ў мінулым, жабрацкай, аграрнай акраіны, пры ўсямерным падтрыманьні ўсяго Савецкага Саюзу і энтузіязме рабочых мас і працоўнага сялянства, ператварылася ў адну з перадавых Савецкіх рэспублік. Створаны ў нас усе неабходныя ўмовы для таго, каб зрабіць усе калгасы сапраўды бальшавіцкімі калгасамі, і на аснове нашай упартай і чэснай працы зрабіць усіх калгасьнікаў, усіх былых беднякоў і сераднякоў заможнымі.

Ад імя лепшых калгасаў, калгасьнікаў і калгасьніц БССР мы даем ленінскаму ЦК партыі і табе, дарагі наш правадыр тав. СТАЛІН, непарушнае слова, што мы ў бліжэйшы час зьнішчым усе недахопы нашага калгаснага будаўніцтва і дабіемся арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня ўсіх калгасаў БССР.

Твае ўказаньні на ўсесаюзным зьезьдзе перадавых калгасаў, твае выступленьне на студзеньскім пленуме ЦК УсеКП(б) «аб рабоце ў вёсцы» і адозву ўсесаюзнага зьезду ўдарнікаў мы зробім праграмай нашай работы, сьцягам нашай барацьбы за бальшавіцкія калгасы. На аснове тваіх указаньняў і пад кіраўніцтвам нашай партыі, мы, калгасьнікі-ўдарнікі, сабраўшыся на свой усебеларускі зьезд, запэўняем Цэнтральны Камітэт нашай партыі і цябе, наш любімы правадыр тав. Сталін, што па-бальшавіцку арганізуем і правядзем весьнавую сяўбу. Мы прыкладзем усе сілы да таго, каб выгнаць з калгасаў нашай рэспублікі кулакоў, падкулачнікаў, усякую белагвардзейскую сволач, жорстка ўдарым па лодырах, прагульшчыках і дармаедах і ўстановім у калгасах цьвёрды парадак, як сваё вока будзем берагчы калгаснае дабро.

Мы добра ведаем, што ад таго, як мы самі арганізуем і расставім нашы сілы, як мы здолеем выкрыць новыя манэўры рэштак кулацтва, шкоднікаў і контр-рэвалюцыянэраў, якія часта пад фальшыва-нацыянальным сьцягам вядуць у нас сваю падрыўную работу супроць савецкай улады, каб адарваць Беларусь ад нашага брацкага Савецкага саюзу, ад рашучай барацьбы з гэтымі антысавецкімі элемэнтамі залежыць далейшы рост, укацаваньне нашых калгасаў і паляпшэньне становішча калгасьнікаў.

Мы жывем у пагранічнай рэспубліцы і нясем таму вялікую адказнасьць перад усім Савецкім саюзам. Мы добра ведаем, што ад нас саміх залежыць пасьпяховае правядзеньне весьнавой сяўбы і высокі ўраджай, высокая даходнасьць калгаснай гаспадаркі, каб і дзяржаве была карысьць і жыцьцё калгасьнікаў бязупынна паляпшалася.

Мы абяцаем табе, наш дарагі правадыр, свайчасова і ў тэрмін выканаць свае абавязацельствы перад пралетарскай дзяржавай.

Каб з посьпехам правесьці весьнавую сяўбу гэтага году, мы заключылі дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве з калгасьнікамі Заходняй вобласьці, і на аснове гэтага разгорнем найшырэйшае спаборніцтва ў кожным раёне, у кожным калгасе, у кожнай калгаснай брыгадзе.

Мы даб'емся таго, што першая вясна другой пяцігодкі стане ў нас вясной высокіх бальшавіцкіх ураджаяў.

Цесна згуртаваўшыся вакол бальшавіцкай партыі, вакол яе генэральнай лініі, пад твайм моцным бальшавіцкім кіраўніцтвам, мы даб'емся таго, што ўсе калгасы БССР стануць сапраўды бальшавіцкімі, а ўсе калгасьнікі заможнымі.

Няхай жыве саюз рабочай клясы і сялянства!

Няхай жыве наша слаўная ленінская партыя камуністаў-бальшавікоў!

Няхай жыве тав. СТАЛІН — першы калгасьнік, наш любімы правадыр і настаўнік!

КОЖНЫ КАЛГАС ПЕРАТВОРЫМ У МАГУТНЫ ФАРПОСТ АБАРОНЫ

Прывітаньне тав. Варашылаву ад усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

Гераічнай Чырвонай арміі і яе баявому палкаводцу — тав. ВАРАШЫЛАВУ, ніле гарачае прывітаньне першы калгасны зьезд Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

БССР — фарпост Савецкага Саюзу ва фубяжы з капіталістычным сьветам — пакрыт тысячамі калгасаў. Жывучы на граніцы, мы асабліва адчуваем, як кожны крок па далейшым умацаваньні калгасаў нянавісьцю і трывогай адгукаецца сярод нашых ворагаў, як кожны наш промах радуе і акрыляе іх.

Мы на гэтым зьезьдзе ня толькі дзелімся вопытам лепшых, але і сьмела ўскрываем нашы недахопы і цьвёрда ўмацоўваем, што стаўка міжнародняй буржуазіі і рэшткаў кулацтва на развал калгасаў будзе біта.

Прыклад росквіту нашай сацыялістычнай прамысловасьці, прыклад вялізарнага росту магутнасьці нашай Чырвонай арміі яшчэ з большай сілай пераконвае нас, што камуністычная партыя, савецкая ўлада, наш правадыр тав. Сталін вядуць нашы калгасы да нябывалага росквіту.

Мы добра разумеем, што калгаснае будаўніцтва зьяўляецца адной з галоўных асноў умацаваньня абароназдольнасьці савецкай краіны. Мы ведаем, што кожны калгас павінен стаць крэпасьцю абароны. Чырвонаармейская часьць і арганізаванасьць, якую мы мелі магчымасьць наглядаць і ў часе нашага зьезду, павінны будуць стаць прыкладам ва ўсёй нашай калгаснай рабоце.

Мы абяцаем дагледаць калгаснага каня так, як за ім дагледаюць у Чырвонай арміі і аўладаць тэхнікай так, як ёю авалодваюць у Чырвонай арміі.

Мы бяром на сябе абавязацельства, каб сапраўды кожны наш калгас стаў непераможнай сталёвай крэпасьцю абароны, каб у кожным калгасе быў выдзелен конь абароны, засеен гэктар абароны, арганізован вайсковы кутон, каб нашы сыны і браты 1911 году нараджэньня прышлі-б у Чырвоную армію пісьменнымі, ведаючымі асновы вайсковай справы, каб кожная чырвонаармейская сям'я карысталася нашым штодзённым падтрыманьнем і ўвагай.

Мы добра памятаем словы нашага правадыра і настаўніка тав. Сталіна: «ні адной пядзі чужой зямлі мы ня хочам, але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому». Мы, працуючы на мяжы, са ўсёй пільнасьцю будзем сачыць за прошукамі нашых ворагаў, міжнароднай буржуазіі, каб кожную мінуту быць гатовымі даць узброены адпор спробам ворага напасьці на нас.

І ў гэтай барацьбе за ўмацаваньне абароназдольнасьці Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік наша камуністычная партыя, наш Савецкі ўрад, наша Рабоча-Сялянская Чырвоная армія, заўсёды знойдзе ў кожным з нас — калгасьнікаў, у кожным з нашых калгасаў — моцную несакрушальную апору.

Няхай жыве Рабоча-Сялянская Чырвоная армія і яе правадыр — ленінскі Цэнтральны Камітэт УсеКП(б)!

Няхай жыве правадыр сусьветнага пралетарыяту тав. Сталін!

Няхай жыве баявы палкаводзец краіны саветаў тав. Клім Варашылаў!

Першая бальшавіцкая вясна 2-й пяцігодкі і задачы калгасаў

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА на ўсебеларускім зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў *)

Што гэта за мерапрыемствы? Я ўжо гаварыў адносна насеньня. Мы ў гэтым годзе паспрабуем, каб абавязкова была два разы ўзарана зямля перад пасевам, і гэтага трэба дабівацца на што-б там ні стала, каб ня было нічога спазьненьня ў тэрмінах пасеву. Мы ўстановілі 12—15 дзён на правядзеньне пасеўнай кампаніі. Тут я павінен спынімся на пытаньні раньняй сяўбы. Некаторыя думаюць, што супраці аб раньняй сяўбе — пустаўвонства. Ня так гэта, таварышы. На вопыце барацьбы перадавых саўгасаў і калгасаў ужо даказана, што раньняя сяўба аўсёды ўстойлівей, што раньняя сяўба дае заўсёды лепшы ўраджай. Таму мы ня толькі агітуем, але і на справе змагаемся за раньнія тэрміны сяўбы.

У вёсцы існуюць такія традыцыйныя прыкмеці, якіх асоблівы прыхільнікі, якіх асоблівы ўплыў яшчэ ў справе ў радзе калгасаў, што вось такую ці другую культуру трэба сеяць ад такога да такога сьвята. Словам, людзі дзейнічаюць па-бяскаму і па-пуўскаму календару. З такімі старымі забабонамі трэба весьці рашучую барацьбу. Мы ў мінулым годзе пасеялі ў якасьці вопыту звышраньні лён і гэты лён уражаў вельмі добра.

Мы завозім шмат мінэральнага ўгнаеньня. Спэцыяльныя заводы яго вырабляюць, але правільным было-б думаць, што раз завозяць мінэральнае ўгнаеньне, дык сваё ўгнаеньне — гэта справа ўжо адкладная, справа лішняя. Таварышы, гной вялікая справа. Напрыклад, мы маем шмат поплаву ў вёсцы. Усім вядома вялікая карысьць яго для глебы. Можна яго шмат сабраць і ўнесьці асабліва пад гародніна культуры. Але ў нас знойдуцца яшчэ такія калгасьнікі, якія прысядзіўшы каваліі зямлі ўнесьці, а рэшта гною і поплаў загіне, ня вывезуць на калгаснае поле. Няправільны такія адносіны. Кожны калгасьнік павінен сказаць, што ён не адным сваім гародзікам будзе жыць, а што ён жыве і будзе жыць агульна-калгасным полем. І калі будзе павышацца ўраджайнасьць, значыць, і ёй будзе атрымліваць больш. А таму трэба гной, які ў яго ёсьць, вывезьці на калгаснае поле. Трэба растлумачыць гэта калгасным масам.

Тав. Якаўлеў у дакладзе аб павышэньні ўраджайнасьці на сэсіі ЦВК Саюзу прывёў такія даныя, што хваробамі і шкоднікамі зьнішчаецца 31,6 млн. тон збожжа ў год, у той час, як мы для ўсяго насельніцтва спажываем у год 29,7 млн. тон збожжа.

Бачыце, якія страты мы церпім. А на досьлеках нашых станцый, скажам, горацкай дасьледчай станцыі, адно пратручваньне насеньня павышае ўраджайнасьць з га на 3—5 пуд. Калі зьмяншыць гэту лічбу нават да 1 пуда з га, то і тады па БССР мы атрымалі-б больш 2 млн. пуд. збожжа з насеўнай плошчы 1932 году. Ад шкароб і шкоднікаў колькасьнае зьніжэньне раўнаецца 30 проц. Шырокія досьледы, праведзеныя ў Лошыцкім садова-гародным інстытуце і інш., гавораць аб тым, што можна зьмяншыць страты ў 2—3 разы правядзеньнем прасьцейшых агратэхнічных мерапрыемстваў і павялічыць наш ураджай больш чым напалову. Па бульбе правядзеньне прасьцейшых мерапрыемстваў (пераробка бульбы, перакладка, прасушка, адборка шпілей, прасушка перад пасевам і г. д.) згодна лабараторных досьледаў станцыі, дало-б нам зьмяншэньне страт на 10 проц. і фактычнае павышэньне ўраджаю бульбы на 1 млн. цэнтн.

Высокі ўраджай — адказнейшая цэнтральная задача, якую паставіла партыя і савецкая ўлада перад сельскай гаспадаркай.

«Надышоў час, калі ад росту гаспадаркі ў пярэдняю, шляхам павялічэньня пасеўных плошчаў, неабходна пераняцць да барацьбы за лепшую апрацоўку зямлі, да барацьбы за паляпшэньне ўраджайнасьці, як галоўнай і цэнтральнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі на дапай стадыі разьвіцьця» (з пастановы ЦК і СНК СССР).

А паляпшэньне ўраджайнасьці — гэта вельмі крапатлівая работа, гэта справа, зьвязаная з лепшым гаспадараваньнем на кожным кавалку зямлі. Калі мы будзем сачыць за тым, каб усё было лепш пасаджана, пасеяна, дагледжана і ўбрана, каб ня было страт, тады мы безумоўна апрымаем больш высокі ўраджай. Гэта разумеюць перадавыя калгасьнікі. Яны сур'ёзна бяруцца за гэту справу і заклікаюць іншых. Напрыклад, дэлегат усесаюзнага зьезду калгасьнікаў ад калгаснага імя Карла Лібкнэхта Гарлаковіч гаворыць наступнае: «Я думаю, што ўсе калгасьнікі пасьвяць пастраўваць прапанову ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў і разгарнуць сацыяборніцтва і ударніцтва. Я перыны ўступаю ў сацыяборніцтва, я заклікаю ўсіх калгасьнікаў пасьлядаваць майму прыкладу з тым, каб дабіцца высокага ўраджаю».

Барацьба за ўраджай — вялікая, адказнейшая задача. А вось з пытаньнем раньняга пасеву на ўсё добра. Некаторыя нават вялікі агрэномы-спэцыялісты, не разумеючы карысьці раньняй сяўбы, гаворыць адкрытае, жыхуць старыны. Я вам прыведу адзін прыклад. Па Ільне ўжо даказана, што раньні пасеў дае лепшы ўраджай, а ў нас нават некаторыя вучоныя людзі, прафэсары, напрыклад, праф. Кайгародаў, у кніжцы «Нармальны расьцьвіт тэрміны сяўбы ільну» гаворыць адносна ільну пастуляцыя: «Лён адна з самых капрызных тэхнічных культур ніліотнага ўмеранага клімату. Зьвяталіва разгіна раньняй тэрміны ільсеву, але адказны да замаразкаў спрэчнім. Як думаюць пакагорыя спэцыялісты-ільнаводы, замаразкі ільну ня пікоднець.

Аднак, узьнікае пытаньне, наколькі тэхнічныя якасьці ільну, які апрацаўся ад замаразкаў, ня церпяць пры далейшым яго разьвіцьці шкоды. З прычыны таго, што на гэта пытаньне няма яснага і катэгарычнага адказу, мы лічым, што лепш палта раньнім пасевам ільну не рыскаваць і пачынаць сяўбу каля сярэдзіны мая на поўні і ў другой палове мая на поўначы».

Ён рацэ позьнюю сяўбу ільну. А я скажу — трэба пасьлаць к чорту такіх прафэсароў, якія выступаюць супроць раньняй сяўбы. У нас ёсьць вялікі вопыт і мы будзем змагацца за раньні пасеў (воплескі).

Мне прыпалося сустрэцца ў Прапойскім раёне з агрэномам-камуністам, дык гэты камуніст-агрэном аблажыўся кітаю кніг (невядома, калі і кім напісаны гэтыя кнігі), бязумоўна, кні гі—добрая рэч, але калі яна толькі мазгі муціць, а ў нас такія кнігі ёсьць, — то такую кнігу трэба выкідаць, бо яна ніякай карысьці ніколі ня прынесьць апрача шкоды і вядзе рассоры аб шматпагодзьнасьці раньняй сяўбы.

Трэба памятаць, што сярод добрых кніг, ёсьць і дрэнныя, акрамя кніг ёсьць мы — жывыя людзі, мы — бальшавікі, мы — партыя, савецкая ўлада, мы — калгасьнікі-ударнікі, якія сваім вялікім вопытам упусьцяць кнігарыі ў кнігі (воплескі).

Мы ня супроць кніг, але мы за добраякасныя кнігі. Мы за такія кнігі, якія адначасова пабудаваны на бальшавіцкім вопыце. А вопыт сьведчыць, што раньні пасеў і ўсякія іншыя агратэхнічныя мерапрыемствы трэба праводзіць з усёй рашучасьцю. Тыя-ж кнігі, прафэсары і спэцыялісты, якія адгаворваюць нас ад гэтага, а часамі і шкодзяць справу, — нам непатрэбны, трэба ад іх зьвільнацца. Вядома, у сваёй большасьці-ж спэцыялісты самагадзіца ідуць на справу павышэньня ўраджайнасьці.

Шырока разгарнуць спаборніцтва і ўдарніцтва

У справе правядзеньня сяўбы трэба разгарнуць шырока сацыяборніцтва і ўдарніцтва. Вы зьвяталіся перадавікамі калгасьнікамі - ударнікамі, вы ведаеце, што значыць добра працаваць. Сацыяборніцтва і ўдарніцтва мы павінны ўкараніць за ўсе працэсы падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы. Трэба арганізаваць сацыяборніцтва ра ёну з раёнам. Вось вы тут на зьезьдзе прадстаўлены дэлегацыямі з усіх раёнаў. Тут пагаварыце адна дэлегацыя з другой, як вы думаеце спаборнічаць раён з раёнам, калгас з калгасам, брыгада з брыгадай і г. д., каб лепш правесьці весьнавую сяўбу. Трэба спаборніцтва разгарнуць паміж адказобнікамі і калгасьнікамі.

Мы зробім правільна і добра, калі на гэтым зьезьдзе заключым дагавор з Заходняй вобласьцю на лепшае правядзеньне весьнавой сяўбы (аплёскі мэты). І трэба гэта зрабіць ня толькі на словах, а бальшавіцкай справай, укараніць гэтае сацыяборніцтва і ўдарніцтва ў кожны калгас, у кожную брыгаду, давесьці да кожнага калгасьніка. Усесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў таксама гэта цьвяньне паставіў.

Трэба вывесьці нашу рэспубліку ў перадавыя, заняць першынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю.

Такім мэтадам, якія мы адбудавалі нашу прамысловасьць, якім мы набудавалі моцную індустрыю, такім мэтадам трэба і зараз змагацца за лепшае выкананьне прафіцыяналу, за посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, за посьпехі другой пяцігодкі. Гэты мэтад трэба па-бальшавіцку ўжыць. Тут калгасьнікі-ўдарнікі павінны раўняцца на гэту пасаду, трэба паглядзець на яго, ці не зьяўляецца ён тэй сволачу, якая прыпла разбураць калгасы. На гэтую справу трэба паставіць лепшых нашых калгасьнікаў, нашых самасольцаў. Тут павінны і могуць адыграць вялікую ролю камсамольцы. Трэба іх навучыць на курсах і ў іншых установах, падрыхтаваць сваіх вучоткікаў.

Тое самае і можна пазавальпеньні ў адносінах расцэнак. Мы ўжо аду бікавалі пастанову аб расцэнках. Незадавальненьні ў адносінах расцэнак заключаюцца ў тым, што іншы раз калгасьнік, які працуе на больш адказнай, на больш цяжкай працы, атрымлівае менш працадзён, чым той, хто працуе на мяжы, са ўсёй пільнасьцю будзем сачыць за прошукамі нашых ворагаў, міжнароднай буржуазіі, каб кожную мінуту быць гатовымі даць узброены адпор спробам ворага напасьці на нас.

І ў гэтай барацьбе за ўмацаваньне абароназдольнасьці Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік наша камуністычная партыя, наш Савецкі ўрад, наша Рабоча-Сялянская Чырвоная армія, заўсёды знойдзе ў кожным з нас — калгасьнікаў, у кожным з нашых калгасаў — моцную несакрушальную апору.

Няхай жыве Рабоча-Сялянская Чырвоная армія і яе правадыр — ленінскі Цэнтральны Камітэт УсеКП(б)!

Няхай жыве правадыр сусьветнага пралетарыяту тав. Сталін!

Няхай жыве баявы палкаводзец краіны саветаў тав. Клім Варашылаў!

*) Працяг. Пачатак гл. у «Зьвязьдзе» № 67 ад 26 сакавіка.

Наладзіць улік, лепш арганізаваць працу

У нашай рабоце мае вялікае значэньне правільны спосаб працадзён і тое, каб лепшыя людзі былі вылучаны на гэтую справу. Тут будзе выступленьне таварышоў з Наркамзему, якія будуць гаварыць аб практычных мерапрыемствах у гэтым пытаньні. Але, калі гаварыць аб працадзнёх, дык мы на цэлым радзе калгасаў маем вялікае іх расьпраўкаваньне. Часта той калгасьнік, які працуе лепш і больш, атрымлівае менш працадзён, чым той, хто дрэнна працуе. У нас ёсьць шмат расьпраўкаваньняў працадзён на розных адміністрацыйных вытратах — на начальства ў калгасах. Гэтага начальства ў нашых калгасах шмат: тут і старшыня праўленьня, і рахункавод, і бухгальтар, і загачык гаспадаркай, і яшчэ шмат начальства. Я думаю, што нам патрэбна менш начальства ў калгасе, тое пітага ня робіць. Трэба так арганізаваць працу, каб начальства скарыстоўвалася за якой-небудзь абавязковай выкананай працы. Вось нам факты: у адным калгасе Шклоўскага раёну за рэвізію, зробленую ў калгасе рэвізійнай камісіяй на працу двух працадзён, залічана па патрабаваньні рэвізора 90 працадзён. Калі потым правяралі гэту справу, дык выявілася, што старшынёй рэвізійнай камісіі быў пазучэн царокай арэлі, які потым быў выключан з калгасу і арыштован.

Такое расьпраўкаваньне працадзён мае месца ці мелося калгасах. Яно непазрочна адбіваецца на продукцыйнасьці працы, асабліва лепшых калгасьнікаў-ударнікаў. Трэба тут устанавіць парадак, а гэта залежыць ад уліку, ад кантролю за заняцьцем працадзён, гэта залежыць ад таго, хто будзе запісваць і як запісваць. Калі той ці іншы калгасьнік ведае, што ён сёньня адпрацаваў на гэтым вучастку, колькі ён выпрацаваў, дык гэта добра. Але калі ў калгасе месяц або больш няма ніякага падліку выпрацоўкі, дык калгасьнік працуе і кажа: «я працую як вол, а вы тут сядзіце, начальнікі ці поўначальнікі, і ня можаце сказаць, колькі я выпрацаваў». Гэта мае месца ва многіх калгасах.

Мы зараз спатыкаліся з выпадкамі, што ў радзе калгасаў на гэтых пасадах сядзяць ня нашы людзі. Якраз яны зацікаўлены ў тым, каб яким-небудзь спосабам увесьці блытаніну, каб калгасьнікам ня было відома, колькі яны выпрацоўваюць, каб яны ня ўзбройваліся для далейшай барацьбы за лепшую працу. Мы часта ў калгасе робім тэм, што калі нанаўся які-небудзь чалавек: пісьменны, дык адразу саджа яго на пасаду рахункавога або загачыка гаспадаркай. Рацэй, чым садзіць яго на такія пасады, трэба ведаць, што гэта за чалавек. Гэтыя-ж сволачы — клясавы ворагі, калі іх выганяюць з горану, прыцэ у калгасы, у саўгасы і пралазяць там рахункаводамі. Там адразу іх не разгусьць, а за гэты час яны вядуць барацьбу, каб разбурыць калгасы. Тому, не гаворыся за тым, каб усякага прыпоўнага пісьменнага чалавека пасадзіць на рабочых. Толькі пры гэтай умове мы ажыцьцёвім лёзунг т. Сталіна аб тым, каб зрабіць нашых калгасьнікаў заможнымі.

Такіх сацыялістычнага будаўніцтва, за посьпехі другой пяцігодкі. Гэты мэтад трэба па-бальшавіцку ўжыць. Тут калгасьнікі-ўдарнікі павінны раўняцца на гэту пасаду, трэба паглядзець на яго, ці не зьяўляецца ён тэй сволачу, якая прыпла разбураць калгасы. На гэтую справу трэба паставіць лепшых нашых калгасьнікаў, нашых самасольцаў. Тут павінны і могуць адыграць вялікую ролю камсамольцы. Трэба іх навучыць на курсах і ў іншых установах, падрыхтаваць сваіх вучоткікаў.

Тое самае і можна пазавальпеньні ў адносінах расцэнак. Мы ўжо аду бікавалі пастанову аб расцэнках. Незадавальненьні ў адносінах расцэнак заключаюцца ў тым, што іншы раз калгасьнік, які працуе на больш адказнай, на больш цяжкай працы, атрымлівае менш працадзён, чым той, хто працуе на мяжы, са ўсёй пільнасьцю будзем сачыць за прошукамі нашых ворагаў, міжнароднай буржуазіі, каб кожную мінуту быць гатовымі даць узброены адпор спробам ворага напасьці на нас.

І ў гэтай барацьбе за ўмацаваньне абароназдольнасьці Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік наша камуністычная партыя, наш Савецкі ўрад, наша Рабоча-Сялянская Чырвоная армія, заўсёды знойдзе ў кожным з нас — калгасьнікаў, у кожным з нашых калгасаў — моцную несакрушальную апору.

Няхай жыве Рабоча-Сялянская Чырвоная армія і яе правадыр — ленінскі Цэнтральны Камітэт УсеКП(б)!

Няхай жыве правадыр сусьветнага пралетарыяту тав. Сталін!

Няхай жыве баявы палкаводзец краіны саветаў тав. Клім Варашылаў!

(Працяг на 2 стар.).

ПРАЦЯГ ДАКЛАДУ тав. ШАРАНГОВІЧА

Умацаваць сацыялістычную жывёлагадоўлю

Жывёлагадоўля зьяўляецца важнейшай задачай, за вырашэньне якой нам трэба рашуча змагацца. У гэтай галіне сельскай гаспадаркі мы мелі вялікія страты. Шкоднікі загубілі значную колькасьць жывёлы. Кулацтва разгарнула вялікую агітацыю за зьнішчэньне жывёлы, прычым частка несьвядомых калгасьнікаў паслухалася гэтай агітацыі. Вялікія страты ў жывёлагадоўлі мы мелі з-за дрэннага догляду жывёлы, а вельмі часта і з-за шкодніцкіх адносін да яе. Мы нясем вялікія страты ад значнага процанту ялавасьці кароў.

Але-ж было-б няправільна прайсьці моўчкі міма тых добрых узораў, якія мы маем у галіне жывёлагадоўлі. Вось прыклады: калгас «Праўда», Лёзьнянскага раёну, за апошнія два гады на фэрме зусім ня мае ялавых кароў. Таксама ліквідаваў ялавасьць і калгас імя Дзяржынскага, Менскага раёну.

Добры догляд кароў дае высокую ўдойлівасьць. Напрыклад, у калгасе «Праўда», Лёзьнянскага раёну, сярэд імя ўдойлівасьць адной кароўы за год — 1.300 літраў малака. У гэтым калгасе ёсьць асобныя кароўы, якія даюць па 2 з лішкам тыс. літраў малака. Плян здачы малака калгас выканаў на 118 проц.

Зусім адваротнае паказвае калгас «Новы шлях», Лёзьнянскага раёну. Сярэдні ўдой з кароўы ў гэтым калгасе — 900 літраў. Такая нізкая ўдойлівасьць — вынік цякучасьці работнікаў фэрмы. На малочнай фэрме гэтага калгасу толькі адна ўзарка з усяго пэрсаналу працуе больш за год.

Асабліва вялізарнейшае значэньне набывае разьвіцьцё сьвінагадоўлі. Тут таксама выключна важнае значэньне мае догляд.

Вось некалькі прыкладаў добрага догляду сьвіней.

Курбыка Ганна і Дубоўская Феня — сьвінаводы СТКФ «Ясная раніца», Старобінскага раёну, — давялі сярэднюю вагу парасят да моманту адлучкі да 9,5 кгр., захавалі ў сярэднім па 6 парасят на апарос. На фэрме абсалютная чыстата. З 357 парасят загінула толькі двое. Працуюць па СТКФ па 1,5 г., прэміраваны па 50 руб.

Дубоўскі Сяргей, загадчык гэтайжа СТКФ. На 1 верасьня агульнае паголоўе — 602 штукі, дарослых матак — 158. Першы перавёў СТКФ на новыя формы арганізацыі працы — арганізаваў 7 брыгад. Адыход маладняка — 19 проц. Працуе на СТКФ паўтары гады. Прэміраваны 50 рублямі.

Кудзіна — сьвінарка СТКФ «Рэспубліка», Талачынскага раёну. Іншы ятар лягернага ўтрыманьня сьвіней. Адыход маладняка давялася да 3,8 проц., сярэдняя вага парасят пры адлучцы — 10 кгр. Працуе на СТКФ два гады, прэміравана 100 рублямі.

СТКФ імя Чарвякова, Мсьціслаўскага раёну. Захавана на апарос 6-7 парасят. Вага парасят пры адлучцы — 10-12 кгр. Сутачная прыбаўка ў вазе адлучаных парасят — 200 гр. Затрата на 1 кгр. прыбаўкі ў вазе не перавышае 6 кгр. Ялавасьць ліквідавана. Загадчык СТКФ — Жылянкоў Пётра.

Наша задача заключаецца ў тым, каб дабіцца абавязковага выкананьня ўсіх мерапрыемстваў, намечаных партыяй і ўрадам па ўмацаваньні жывёлагадоўлі, каб спыніць разбазаваньне фэрм, ліквідаваць ялавасьць і адыход маладняка, умацаваць і пашырыць кармовую базу, паставіць лепшых людзей для догляду жывёлы, ачысьціць склад сьвінароў, даярак і інш. ад клясава-варожых элемэнтаў.

Зробім калгасы бальшавіцкімі, даб'ем кулака

Наша задач — рашуча ачысьціць калгасы ад кулакоў, гультаёў, пазкулачнікаў, бязьлітасна караць шкоднікаў і расхрадальнікаў калгаснай маемасьці.

Аб тым, як часта кулакі па вачох у калгасьнікаў шкодзілі калгасам сьведчаць наступныя факты:

Тав. Шкробава з калгасу «Першага мая» (Рагачоўскага раёну, Заполькага сельсавету) на зьлёце ўдарнікаў раёну расказала: «Мы выбралі сабе загадчыка гаспадаркай. Як быццам чалавек і нічога сабе, але мы не правералі яго. Вось ён і выкінуў нам штуку. Маладзіці мы два дні грочку. Прыйшоў ён да нас праз пару дзён дый кажа: «Ну, бабы, прапала ўсё, ня будзе ў нас ні круп, ні бліноў; ня грочка ў нас, а мякіна». Сабраліся мы, жанчыны, і давай мякіну правяваць, і што вы думаеце, з мякіны навеялі 40 пудоў чысьценькай грочкі. Вось якія падкавыркі робяць. Мы яго пад суд аддалі».

Калгасьнік Лаўрык з калгасу «Лёзьнень» (Чэрвеньскі раён) расказвае: «Наш калгас багаты, быў-бы яшчэ багацейшым, каб ня шкодзілі кулакі, а яны яшчэ і цяпер ня вычышчаны, напрыклад, Красная Апатка. Нядаўна мы заўважылі пацёртае шкло ў даброх і катлох, дзе варыць корм сьвіньням. Гэта работа кулакоў, якія хацелі зьнішчыць сьвіное стада».

Максімава з калгасу «Трускавік», Старасельскага сельсавету, Віцебскага раёну, расказвае: «У 1929 годзе першым у сельсавеце арганізаваўся наш калгас з 6 батракоў, у тым ліку і я першай ўвайшла ў калгас. Зараз у нашым калгасе — звыш 100 гаспадарак. Шмат шкоды прычынілі нам кулакі, апанукалі нас і нашу ўладу, разбазарвалі маемасьць, зьнішчалі жывёлу. Усё гэта рабілася вельмі замаскавана. Вось прыкладам, як яны зьнішчылі жывёлу: цэлымі днямі ня поюць і ня кормяць кароў, а потым натруць языкі шчоткай і выклікаюць вэтэрынарнага доктара. Вэтэрынарны доктар кароў бракуе, як непагодную, і яе потым рэжуць. Рабілі і так: возьмуць перакормяць парэзай мякінай карову і яна здыхае. Ералі лён. Гарсавету давалі весткі, што пасеялі ячменю 22 га, а ў сапраўднасьці — толькі 11 га».

У калгасе «Камунар», Віцебскага раёну, рахункаводам працуе былы цьвёрдазаданьнік Прудзікаў. Ён так заблытаў улік, што нельга высьветліць, куды зьніклі 15 цялят, 19 плугоў, 9 борон. У гэтым калгасе 22 проц. цьвёрдазаданьнікаў.

Вось, напрыклад, калгас «Зьвязда», Бобіхаўскага сельсавету, Нараўлянскага раёну, які цалкам папаў у палон кулакоў. Кулакі і жандары пралезьлі ў калгас і разбурылі яго самым бесшабашным парадкам, зьнішчалі цягавую сілу, распрадавалі маемасьць, гнаілі бульбу і гародніну, давялі да развалу калгас. Калгасьнікі кінулі на работу хадзіць. Беднату прыцісьнулі.

Хто-ж быў у калгасе (усе яны зьнішчаны)?

З членаў праўленьня калгасу:

Карпаш Цімох — цьвёрдазаданьнік, захватчык калгаснай зямлі і сена; Бахонка Есіп — цьвёрдазаданьнік, удзельнік кулацкіх сходаў; Бандарэнка Еўп — дачка кулака; Сроцкі Сыдпкан — сын кулака.

З членаў рэвізійнай камісіі:

Ярош Яўхім — цьвёрдазаданьнік; Кірылоў Пімен — сын кулака.

З членаў калгасу:

Кірылоў Маркел — у 1930 годзе быў раскулачан; Мельнік Яўхім — быў раскулачан, захапіў у сваё ка-ністаньне калі паўтара га зямлі; Бандарэнка Васіль — таксама; Літвін Цімох — быў раскулачан; Харапчук Іван — таксама; Атаманчук Мікалай — цьвёрдазаданьнік; Фелісеў Мірон — цьвёрдазаданьнік, быў у бандзе; Пілінонька Іван — цьвёрдазаданьнік, перад уступленьнем у калгас разбазарыў усю маемасьць; Лемантук Аркін — цьвёрдазаданьнік; Тугай Лаўрон — цьвёрдазаданьнік, самачынна браў конай для апрацоўкі захопленай зямлі; Тугай Ніканор — цьвёрдазаданьнік; Тугай Тацьцяна — цьвёрдазаданьніца, захапчыца зямлі, перад уступленьнем у калгас разбазарыла маемасьць; Ярмоленка Рыгор — цьвёрдазаданьнік; Фэнцьмана Сцяпан — цьвёрдазаданьнік; Атаманчук Пракоп — былы спраўнік, пазбаўлены права голасу; Бассова Есіп — цьвёрдазаданьнік, за контрреволюцыйную работу ваган затыкмон. І яшчэ дзесяць такіх — усяго 26 гаспадарак.

А вось працуючыя калгасу за кастрычнік месяц 1932 г.

Брыгада № 1: Батон Цімох працуе 21 дзень; Сакач Павал — 13 дзён; Дубоўскі Аўлам — 14 дзён; Гудзіч Андрэй — 16 дзён; Дубоўскі Алесь — 8; Пашкоўскі Хведар — 7 дзён.

Брыгада № 2: Гуцьчык Рыгор працуе 16 дзён; Хвощанка Язаў — 14 дзён; Сіроцкі Язаў — 15 дзён.

Як-жа кіраўніцтва гэтага калгасу змагаецца з прагульшчыкамі і расхрадальнікамі калгаснай маемасьці? Прыведу прыклады рашэньняў таварыскага суда, які існуе ў калгасе.

Справа № 3 ад 7-IX—32 году за самавольны зрыў (фактычна пазражу) 10 кгр. памідораў аштрафаваць на тры рублі Цесавец Дуню, Бобр Марыну, Ярош Алесю.

Справа № 5 ад 7-IX—32 г. за пазражу калгаснай капюшыны Харучэнка, Атаманскага і Штраст аштрафаваць на 3 руб.

Справа № 2. За адрэз гужа ад хамута Гурвіча аштрафаваць на 3 р.

Справа № 10. За тое, што ў часе абеду Ярош пусьціў коняй на канюшыну, ад чаго, аб'еўшыся, здох конь, аштрафаваць яго на 3 руб. у фонд інвалідаў.

Хто-ж у гэтым вінаваты? Вінаваты самі калгасьнікі, якія далі над сабой пасьмяяцца кулаку і пазкулачніку, злодзею і гультаю, якія аб'ядаюць і расхрадаваюць калгасную ўласнасьць. Вінавата, зразумела, і кіраўніцтва раёну.

Зусім правільна гаворыць у сваёй сёдзешняй першы ўсесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў:

«Кожны сумленны калгасьнік, кожны ўдарнік павінен адказваць ня толькі за сябе аднаго, а прымусі за дзесятак сваіх бліжэйшых суседзяў, таварышоў па рабоце. Толькі тады, калі ён, сумленна працуючы сам, даб'ецца таго, што вакол яго другія 10 будуць таксама сумленна працаваць, толькі тады, калі ён бязьлітасна будзе выкрываць шкоднікаў, кулакоў, жулікаў, злодзеяў, злосных прагульшчыкаў і здолее падняць супроць іх іншых сумленных калгасьнікаў, а ня будзе мэўчаць, ня будзе пазіраць на ўсе бясчынствы скрозь пальцы, — толькі тады ён будзе мець права насіць гапаровую годнасьць ударніка, толькі тады даб'ецца ён посьпеху, толькі тады не загіне марна праца ўдарнікаў».

Гэта патрабаваньне ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў мы павінны абавязкова выканаць.

Аб аднаасобніку

Гаворачы па зьезьдзе аб малых калгасах, мы ні ў якім разе не павінны працускаць і аднаасобніка. Аднаасобнік у нас у Беларусі займае вялікае месца ў пасеве. Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў аднаасобным сэктары ідзе дрэнна, аб чым гавораць факты па Магілеўскім, Шклоўскім, Бабруйскім і інш. раёнах.

У радзе сельсаветаў Магілеўскага раёну планы райза зьменшаны. Пітаўскі сельсавет плян зьменшыў на 148 га. У вёсцы Буйнічы некаторыя аднаасобнікі ня ведаюць, дзе ім адводзіцца зямля. Страхавых, пасеўных фондаў ссыпана менш, чым паказана ў зводках.

У радзе сельсаветаў Шклоўскага раёну (Нічыпараўскі, Стараводзінскі сельсаветы) ня ўзята пашпіска ад усіх аднаасобнікаў аб захаваньні пасеньня ў адпаведнасьці з плянамі сяўбы.

У Бабруйскім раёне (вёска Аколіцы — Каменскага сельсавету, Слабада, Багушэўка — Багушэўскага сельсавету, Тажылавічы — Кавалеўскага сельсавету) ускрыты факты адкрытага кулацкага антысавецкага сабатажу. Кулакі і інш. антысавецкія элемэнты агітавалі аднаасобнікаў за нерыхляцьце плянаў сяўбы.

У нас ёсьць такія выпадкі, калі некаторыя калгасьнікі разважаюць так. «Раз я стаў калгасьнікам, раз я ўвайшоў у калгас, то да аднаасобніка я ня маю ніякага дачыненьня». Як быццам мы вялікай сьцяной адгароджаны адзін ад аднаго.

Вы-ж былі раней таксама аднаасобнікамі — беднякамі і сярэднякамі і сталі калгасьнікамі. Вы сталі раней на правільны шлях, увайшлі ў калгас і змагаецеся за калгасную вытворчасьць, за ўмацаваньне калгасаў. Але трэба мець на ўвазе, што і гэтыя беднякі і сярэднякі, сёньняшнія аднаасобнікі, заўтра стануць калгасьнікамі. Адмяжоўвацца ад іх нейкай сьцяной мы ня можам і ня маем права. Вы, калгасьнікі, павінны ўвесь свой вопыт арганізацыі лепшай падрыхтоўкі да вясны перадаць аднаасобнікам. Мы павінны весьці сярод аднаасобнікаў работу, паказваць ім на прыкладах, па практыцы калгасу, як трэба будаваць сацыялістычную гаспадарку, як трэба будаваць і ўмацоўваць нашы калгасы. Калі мы будзем так рабіць, то мы будзем мець вялікі прыліў у калгасы.

Зараз калгасы самі за сябе агітуюць. На вопыце навоці і яркіх даказаньнях, што калгасны шлях верны. Трэба скарыстаць вопыт калгаснага будаўніцтва, як належыць. Зараз той ці іншы аднаасобнік пачэша пятылішку і скажа: «Чаму я раней ня ўступіў у калгас, прапусьціў столькі часу, а калгасны-ж — правільны шлях». У радзе раёнаў мы маем вялікі прыліў у калгасы. Бязумоўна, няправільна будзе, калі некаторыя калгасы адмаўляюцца пакуль прымаць у калгасы. Але правільна робяць тыя калгасы, якія жорстка правяраюць, патрабуюць, каб уступаючы ў калгас аднаасобнік прынёс з сабою ў калгас тую маемасьць, якую ён мае, пасеньне для пасеву на тую плошчу, якую ён меў, каб ён прыйшоў у калгас з перазбазаранай гаспадаркай.

Мы павінны праверыць, як аднаасобны сэктар забясьпечан пасеньнем, павінны патрабаваць, каб той пасеўны плян, які даў аднаасобнікам, быў выкананы абавязкова. Хто ня выканае, найбольш злосных будзем прыцягваць да адказнасьці.

Выканаць абавязкі перад пралетарскай дзяржавай

Новы закон аб абавязковай паставе збожжа дзяржаве вы напэўна чыталі, і таму я падрабязна растлумачваць яго ня буду. Гэты закон, кажучы словамі тав. Кагановіча, «уносіць сапраўдную ліквідацыю ў пытаньне аб абавязках калгасаў і аднаасобнікаў перад дзяржавай».

Гэты закон дае магчымасьць загадзя фасіраваць, колькі хлеба калгас павінен здаць дзяржаве і колькі ссыпіць у рэзервы калгасаў і калгасьнікаў. Закон дае магчымасьць лепш весьці плянавую гаспадарку. Ён палепшае становішча калгасаў, якія добра працуюць, бо чым калгас больш і лепш засее, тым больш зможа здаць хлеба для сваіх улясных патрэб, а таксама і калгаснага тэндэлю.

Коснны з вас чыталі прамову тав. Сталіна на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б). У гэтай прамове з усёй бальшавіцкай прамотай выкрыты недахопы нашай работы ў вёсцы і намечаны канкрэтныя праграма далейшай работы. Я хачу ў сваім выступленьні звярнуць увагу на ўказаньне тав. Сталіна адносна атрымуваньня бедных калгаснага тэндэлю. Асмаўляя бедні заключаецца ў тым, што ў радзе месц мы маем ажыўленьне спекулянцкіх элемэнтаў і перакупшчыкаў. Наша задача, усямерна разгортваючы калгасны тэндэль, змагацца з перакупшчыкамі і спекулянтамі. Неабходна выканаць указаньне т. Кагановіча, зроблене ім на ўсесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў:

«Мы павінны пахаваць на ўсіх без выключэньня калгасьнікаў і аднаасобнікаў жонак ўсялякіх таго, што выкананьне дзяржаўных абавязацельстваў ёсьць першая справа кожнага калгасу і калгасьніка, сапраўдны ардэнаг савецкай дзяржавы. У асобнасьці мы павінны рашуча змагацца са спекулянтамі-перакупшчыкамі».

Мы ў гэтым годзе праводзілі лагатоўкі мосна. Дрэнна раней ішлі ў Беларусі загатоўкі, але потым, пасьля большавіцкіх указаньняў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР закрутілі як ніклешыць, і выкавалі плян па збожжы і па бульбе. Па ільну яшчэ поўнасьцю ня выканалі.

Тут на зьезьдзе ёсьць шмат прадстаўнікоў ільнаводных раёнаў. Калгасьнікі-ўдарнікі з гэтых раёнаў мабыць будуць выступаць і гаварыць пра лён. Трэба адзначыць, што мы дрэнна працавалі над ільном, дрэнна пасеялі, дрэнна даглядалі, шмат ільну згнаілі. Некаторыя калгасьнікі і аднаасобнікі каюцца. Трэба гэтыя ўрокі з ільном улічыць, каб пасеяць, убраць і апрацаваць яго лепш. У падрыхтоўцы да вясны ільнаводчыя раёны дуць дрэнна. Трэба, каб яны падцягнуліся і ліквідавалі сваё ганебнае адставаньне.

Лён як і ў мінулым годзе мы будзем сёлета кантрактаваць. Трэба ўлічыць урокі загатовак ільну і ў першую чаргу трэба дабіцца таго, каб калгасьнікі і аднаасобнікі поўнасьцю і добраякасна пасеялі лён, добра яго ўбралі і апрацавалі, а потым акуратна і добраякасна выканалі свае абавязкі па ільне перад пралетарскай дзяржавай.

Вось тыя пытаньні, якія я хацеў закрануць у сваім дакладзе.

* * *

Яшчэ два пытаньні, таксама зьвязаныя з калгасным будаўніцтвам, — гэта аб гародах і прысядзібных землях. Я не кажу аб нормах гародаў і сядзібных земляў. Справа ў тым, што гэтыя нормы ў радзе выпадкаў, калгасы нікі самі гэта пацьвердзяць, бяспраўныя, бо ў некаторых калгасьнікаў ёсьць свае самастойныя гаспадаркі.

І нават мы маем імкненьні з боку некаторых калгасьнікаў пашырыць гэтыя гаспадаркі, прыпісаць новыя землі. Гэта няправільна, таварышы, гэта фактычна кулацкая справа, бо калі калгасьнік мае сваю ўласную гаспадарку ў 1,5-2 га, дык у першую чаргу ён будзе аддаваць увагу ўласнай зямлі, а не калгаснай, як гэта і мела месца ў мінулым годзе. Мы на супроць гароду, прысядзібных земляў. Мы толькі супроць таго, каб стаўрэць побач з калгасьнікамі аднаасобніка на па сутнасьці ўласную гаспадарку ў калгасе. Мы супроць 1,5—2 га сялянск

ПРАМОВА СТАРШЫНІ ЦВК БССР тав. ЧАРВЯКОВА НА ЎСЕБЕЛАРУСКІМ ЗЬЕЗЬДЗЕ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Таварышы, шаноўныя - дэлегаты! Перша рабоўрускі з'езд ударнікаў-калгаснікаў шэфіны адыграць вялікую ролю ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання і далейшага развіцця калгаснага руху на Беларусі.

